Жыве Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№66(579) 7 красавіка 1993 г. Серада. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 618700 экз. Кошт у розніцу — 4 руб.

ФАКС

Вкратце

Большая группа белорусских предпринимателей приняла участие в международном семинаре в Москве.

Участники семинара взялись самостоятельно решать валютно-финансовые и правовые проблемы, которые существуют сегодня между бизнесменами Содружества и деловыми людьми ближнего зарубежья.

❑

Демократические силы республики начали сбор подписей против присоединения Беларуси к системе коллективной безопасности стран СНГ.

❑

По всей линии грузино-абхазского противостояния вчера продолжались перестрелки.

Идут бои в Очамчирском районе, где действуют абхазские партизаны, грузинская сторона на участке Лабра—Пакуашь понесла потери.

❑

Великобритания, Российская Федерация, США сообщили Беларуси о дополнительных гарантиях, которые эти государства готовы предоставить республике в связи с ее присоединением к Договору о нераспространении ядерного оружия и ратификацией Договора СНВ-1.

Движение "зеленых": только вверх!

Вчерашний курс валют банка "Комплекс" в Минске

Наименование валюты	Скупка	Продажа
Доллар США	765	765
Немецкая марка	460	460
Английский фунт	1072	1072

На вчерашних торгах Московской межбанковской валютной биржи доллар шел уже за 717 рублей — на двадцать рублей дороже, чем на прошлой неделе.

По мнению экспертов, курс "зеленых" в республике после недавней стабилизации в ближайшие дни вновь подскочит до рекордного уровня и перевалит за восемьсот "деревянных".

❑

На торгах во вторник на Белорусской фондовой бирже были желающие купить доллар за тысячу сто рублей. Однако не нашлось продавцов...

Кредиты Национального банка по-прежнему держатся на высоте. На три месяца 50 миллионов вчера брали под 217 процентов. Всего же было выставлено 950 миллионов.

Антон ЧЕКОВ.

И неизвестно, какое из зол наименьшее

На таджикско-афганской границе группа вооруженных лиц захватила десять российских пограничников.

По сообщению радио "Свобода", российские власти выясняют, кем именно совершен захват — афганскими моджахедами или антиправительственными таджикскими формированиями.

...А в ООН — бумажная перестрелка?

Азербайджан обратился с просьбой о созыве заседания Совета Безопасности ООН для обсуждения "широкомасштабной агрессии Армении против Азербайджана".

В то же время в письме постоянного представителя Армении при ООН Александра Арзуманяна на имя председателя Совета Безопасности нынешние события интерпретируются как результат "массированного наступления" регулярных вооруженных сил Азербайджана.

Приезжай, Каттани!

В Варшаве состоялась международная конференция, посвященная проблемам организованной преступности, мафии и терроризма в посткоммунистических обществах.

Согласно прогнозам, связь между преступными группами будет более исправной, чем между новыми независимыми государствами.

Андрей КОРСАК.

...Чтоб к штыку приравняли перо?

Расширенная рада Союза писателей Беларуси приняла обращение к Верховному Совету, Совету Министров, ко всем гражданам республики, в котором высказала решительное "нет" перспективе вхождения Беларуси в какой-либо военный союз.

Представители творческой интеллигенции считают, что Беларусь должна быть независимым, безъядерным и нейтральным государством.

Михаил СОКОЛОВ.

Не только для чемпионов

В посольстве Итальянской республики в Минске подписан договор о создании итало-белорусского совместного предприятия "Динамо программ".

Свои усилия пожелали объединить итальянская фирма "Униформс программ" из Пармы и текстильное предприятие "Динамо" из Гродно. К сведению: именно в Парме выпускается всемирно известная спортивная одежда марки "Чемпион".

Есть контакт? Пора за дело

Еще одна большая группа польских бизнесменов из Катовицкого воеводства побывала в республике по инициативе общества "Беларусь — Польша".

Цель приезда — установление экономических контактов. Среди интересных проектов — деловое партнерство "БелАЗа" и завода в городе Хжанове по созданию совместного производства строительных машин.

Георгий КИСЛЯК.

Пираты приземлились неудачно

Два вооруженных пистолетами воздушных пирата угнали вчера китайский авиалайнер "Боинг-737" с 197 пассажирами и членами экипажа, выполнявший рейс Шэнчжэнь — Пекин.

По требованию преступников летчики совершили посадку в международном аэропорту Тайбэя, где угонщики попросили предоставить им политическое убежище. Премьер-министр Тайваня Лань Чань заявил, что преступники арестованы, с ними поступят в полном соответствии с международными законами, самолет и пассажиры будут вскоре возвращены в Китай.

Леонид КОТОВ.

Женщина на корабле...

Запуск американского космического корабля многоразового использования "Дискавери" вчера был отложен всего лишь за одиннадцать секунд до запланированного старта.

Экипаж, состоящий из четырех мужчин и одной женщины, должен был провести на околоземной орбите восемь дней, занимаясь изучением защитного озонового слоя земной атмосферы.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь N 186

Аб пераносе дня адпачынку ў красавіку 1993 г.

У мэтах стварэння спрыяльных умоў для адпачынку працоўных і рацыянальнага выкарыстання рабочага часу ў красавіку 1993 г. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

перанесці дзень адпачынку з суботы 24 красавіка на панядзелак 26 красавіка 1993 г.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.КЕБІЧ.

Кіраўнік спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М.КАЎКО.

31 сакавіка 1993 г.

г.Мінск.

Хроніка

Веснавая сяўба — клопат прэм'ера

5 красавіка ў другой палавіне дня Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.Ф.Кебіч вылецеў у Маскву для сустрэчы з кіраўніком расійскага ўрада В.С.Чарнамырдзіным. Галоўная прычына паездкі — цяжкасці ў забеспячэнні гаруча-змазачнымі матэрыяламі сельскай гаспадаркі рэспублікі. На думку В.Ф.Кебіча, такое становішча можа сур'ёзна ўскладніць вясенне-палявыя работы.

На перагаворах дэталёва абмеркаваны пытанні паставак расійскай нафты, а таксама іншыя праблемы эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. Вечарам В.Ф.Кебіч вярнуўся ў Мінск.

Белінфарм.

Да ведама народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь

Нечарговая адзінаццатая сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь прадоўжыць сваю работу 8 красавіка 1993 года ў 9 гадзін 30 хвілін у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у Доме ўрада.

Газета — читатель

Не от хорошей жизни...

В последнее время на страницах всех без исключения газет резко возросло количество рекламных материалов. Это касается и моей любимой "Народной". Скажите, пожалуйста, что заставило редакцию пойти на такой шаг?

Николай СОРОКОВИК.

г.Минск.

Уважаемый Н.Сороковик!

Подобный вопрос задают многие читатели. Ответ вам и всем остальным один: не от хорошей жизни пошли газеты на увеличение объема рекламных материалов. Что касается "Народной газеты", то с огромнейшим трудом приходится сводить концы с концами. Возросшие в сто и более раз цены на бумагу, различные услуги быстро "проглотили" те средства, которые мы получили от подписки. Еще в прошлом году правительство пообещало покрыть расходы Министерства связи и информатики по экспедированию и доставке газет и журналов, но, к сожалению, пока "Народной" это коснулось лишь частично. Как только закончилась подписка, Минсвязи удержало деньги не только за проведение самой подписной кампании, но и за то, что в будущем издания будут доставляться подписчикам. Сколько ни заостряли журналисты внимание на незаконности таких действий, Совет Министров не поправил свое министерство.

Вместо этого сделан "благотворительный" жест: мы, мол, компенсируем расходы, связанные с распространением и доставкой печати, напрямую редакциям. Что получилось? Минсвязи удержало с "Народной газеты" 68 миллионов рублей почти полгода назад, затем, в январе и феврале, еще 4 миллиона. Итого 72 миллиона рублей давным-давно работают не на редакцию, а на министерство.

Сколько же "Народной газете" вернули? Меньше половины. И то лишь недавно и после неоднократных обращений к С.С.Шушкевичу и В.Ф.Кебичу. Распоряжение Совмина подписано на полную сумму, но в Минфине, к сожалению, не торопятся его выполнять.

Вот и приходится нам думать-гадать, как не остановить выход газеты. Понятно, увеличение количества публикуемых рекламных материалов — тот спасательный круг, за который сейчас держатся многие газеты, в том числе и "Народная".

Будем надеяться, положение улучшится и материалы рекламного характера мы сможем помещать в основном в специальных приложениях или вкладышах, которые читателям будут доставляться бесплатно вместе с газетой.

Редакция "Народной газеты".

Взгляд журналиста

Найдет ли Станислав Шушкевич спасительный ход?

Сергей ПЛЫТКЕВИЧ

В одной из своих корреспонденций я как журналист поставил вопрос: "Повторит ли Станислав Шушкевич путь Горбачева?"

В ней я попытался разобраться, кто же обладает реальной властью в Беларуси, высказал свой прогноз возможного развития событий в республике и в связи с этим —предположение, что может ожидать Председателя Верховного Совета Беларуси.

Напомним нашим читателям несколько строк из той публикации.

"За прошедший год Станислав Станиславович в принципиальных вопросах несколько раз кардинально расходился с оппозицией, и она от него отвернулась. А для бывших коммунистов Шушкевич со своей демократичностью, деликатностью так и остался интеллигентной "белой вороной". Не примкнул он ни к одной партии. И сегодня ни одна из них открыто не заявляет о поддержке Председателя Верховного Совета. Все в оппозиции. И БНФ, и коммунисты, и остальные партийные карликовые образования. А реальная власть фактически у Совмина, хотя главой государства считается Станислав Шушкевич...

Безусловно, такое положение стабильным никак не назовешь. И с определенной уверенностью можно прогнозировать, что этот шаткий статус-кво в республике будет сохраняться до первой крупной ошибки Шушкевича или до изменения ситуации в России".

Итак, прошло два месяца. Что же мы имеем сегодня? Ситуация в России настолько неопределенна, что, кажется, смена власти в Кремле может произойти чуть ли не каждый день. В Беларуси в процессе хитроумных шахматных политических игр Председатель Верховного Совета получил опаснейший шах: его заставляют сделать выбор, провоцируют совершить ту самую "первую крупную ошибку".

Но обо всем по порядку.

Перед началом нынешней 11-й внеочередной сессии Верховного Совета, на которой должны были быть приняты важнейшие законы о суде, прокуратуре и т.д., Председатель Совмина республики Вячеслав Кебич выступил со стратегической, как ее назвали совминовские газеты, инициативой: России, Беларуси и Казахстану создать новый экономический блок, Беларуси необходимо войти в систему коллективной безопасности. Просовминовское большинство в парламенте среагировало моментально: только эта инициатива может спасти экономику Беларуси! С поддержкой выступили также многочисленный директорский корпус Беларуси, коммунистические партии и приближенные к ним движения, даже Союз воинов-афганцев.

Чем могли ответить на этот кардинальный поворот во внешней политике Беларуси демократические силы республики? Тезис "Независимость прежде всего!" парламентское большинство отвергло однозначно: нам надо думать, как народу выжить! А заключив экономический и военно-политический союз с Россией и Казахстаном, твердили ораторы-коммунисты, мы вернемся к прежней тесной интеграции, получим доступ к сырью и энергетическим источникам по низким льготным ценам, снова получат заказы и финансирование многочисленные военные заводы Беларуси.

Попытка оппозиции раздуть скандал, связанный с валютными махинациями, в которых оказалась замешанной и жена Кебича, также не удалась. Парламент не создал комиссию по расследованию использования валютных средств, а когда лидером оппозиции Зеноном Позняком был поставлен вопрос о вынесении премьер-министру вотума недоверия, подавляющее большинство проголосовало за поддержку Кебича. На состоявшемся совместном закрытом заседании президиумов Совмина и Верховного Совета Председатель Верховного Совета Станислав Шушкевич, являющийся твердым и последовательным сторонником нейтрального и безъядерного статуса Беларуси, остался фактически в одиночестве. Из членов Президиума Верховного Совета его поддержали только Нил Гилевич и Александр Соснов. Еще двое-трое промолчали, остальные, как и весь Президиум Совмина, выступили в поддержку позиции премьер-министра Вячеслава Кебича. А решение — предложить руководству республики начать переговоры о создании экономического блока, в который вошли бы Россия, Беларусь и Казахстан, — парламент уже принял.

(Окончание на 3-й стр.)

Васіль БЫКАЎ:

"Гісторыя нам дала незвычайны шанц. Але Беларусь не ўмее выкарыстаць яго..."

Беларусь, як і многія іншыя дзяржавы, што стварыліся на тэрыторыі былога СССР, падышла да крытычнай кропкі. З кожным тыднем становішча многіх людзей пагаршаецца, а дарогі, па якой можна было б выбрацца з гэтай багны, не бачна.

Заблыталіся простыя людзі і ні на кога, калі меркаваць па сацыялагічных апытаннях, ужо не спадзяюцца. Блытаніна і ў галовах дзяржаўных дзеячаў, палітыкаў. То яны выступаюць за стварэнне бяз'ядзернай і нейтральнай Беларусі, то раптам заяўляюць, што без саюзу з Расіяй, без калектыўнай бяспекі рэспубліцы не выжыць.

Дык дзе яна, ісціна? Дзе той адзіна правільны шлях? Аглядальнік "Народнай газеты" Сяргей Плыткевіч звярнуўся з гэтым пытаннем да народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Звярнуўся таму, што ўсё жыццё Васіля Быкава — гэта прыклад сумленнага служэння сваёй Радзіме, яго асабісты лёс — гэта лёс нашай Беларусі. І яго слова, якім бы горкім яно ні было, павінны пачуць і простыя людзі Беларусі, і яе кіраўнікі...

— Становішча сапраўды вельмі складанае. Калі гаварыць пра нашу суверэннасць, то тут трэба мець на ўвазе, што гісторыя нам дала незвычайны шанц. Шанц, які прыпадае нават не на кожнае стагоддзе, а, можа быць, адзін раз на некалькі стагоддзяў. І ён менавіта выпаў на наш час. Але, я думаю, Беларусь не змагла пакуль што выкарыстаць гэты шанц. І вось цяпер шмат якія магчымасці выслізгваюць з рук нашага кіраўніцтва. І, што яшчэ горш, — з рук нашага народа.

Тут, канешне, можна гаварыць пра многія прычыны. Але галоўная прычына заключаецца ў тым, што наша грамадства аказалася не гатовым да нашай суверэннасці. І таму ў нас многае пайшло наперакасяк. Апроч таго, трэба мець на ўвазе тую акалічнасць, што ажыццяўляць нашу суверэннасць выпала людзям, якія зрабіць гэтага не маглі. Тая партакратыя, камуністычная наменклатура, што на момант абвяшчэння суверэннасці аказалася ва ўладзе, проста не здольная была, не магла і не хацела ажыццяўляць гэтую суверэннасць. Натуральна, што ў такіх умовах цяжка было спадзявацца на нейкую значную ўдачу. Адбіваецца, безумоўна, і эканамічны крызіс, які абрушыўся не толькі на Беларусь, але і на ўсе рэспублікі былога СССР. Ён проста не дае разгарнуцца і нават марнуе тыя невялікія пазітыўныя дасягненні, якія ўдалося здабыць напачатку.

— Васіль Уладзіміравіч, але ж асноўныя абвінавачванні зараз гучаць у бок дэмакратаў. Маўляў, менавіта яны развалілі дзяржаву. А між тым колькі тых дэмакратаў у кіраўніцтве Беларусі?

— У тым і справа, што ў масавай свядомасці наш крызіс атаясамліваецца з уладай дэмакратаў. Але ж мы ведаем, што дэмакраты тут абсалютна ні пры чым. Наша грамадства як было, так і працягвае заставацца посткамуністычным. І хоць наменклатура цяпер разбаўлена нейкай колькасцю нацкамуністаў, але асноўныя пытанні жыцця Беларусі вырашаюць ранейшыя кадры, кадры артадаксальна камуністычныя. І, канешне, гэта будзе вялікі падман, калі тыя сілы, якія ўсяляк перашкаджалі перабудове грамадства, зараз самі ажыццяўляюць гэтую перабудову. Яны проста сабатуюць яе і ўсе няўдачы спісваюць на рахунак міфічных дэмакратаў, якімі лічаць нейкія тры дзесяткі чалавек з апазіцыі БНФ у парламенце.

— У той жа час кіраўніцтва нашай рэспублікі не стамляецца заяўляць, што беларусы жывуць значна лепш, чым грамадзяне іншых дзяржаў СНД, і што гэта вынік правільнай эканамічнай палітыкі.

— Гэта не вынік нашай добрай палітыкі, гэта вынік хвасцізму, які характэрны для палітыкі нашага кіраўніцтва. Мы ўвесь час ідзём у эканамічным рэчышчы за Расіяй. І да той кропкі, што Расія ўжо дасягнула і перайшла, мы набліжаемся. Так што самая галеча, якую перажывае зараз Расія, нас падпільноўвае наперадзе. Мы падаем аднолькава, можа, нават з аднолькавай хуткасцю, проста наша падзенне адбываецца следам за Расіяй і ў абсалютным вымярэнні абяцае пераўзысці Расію.

— Парламент Беларусі адмяніў сваё ж рашэнне аб часовым прыпыненні дзейнасці КПБ—КПСС, і, безумоўна, гэты акт адаб'ецца на жыцці рэспублікі. Ужо розныя меркаванні гучалі наконт гэтага рашэння, што думаеце пра яго Вы?

— Мне думаецца, ідзе паслядоўны, мэтанакіраваны працэс па аднаўленню ўлады камуністаў на Беларусі. На Украіне такога не адбылося, а вось у Расіі, і асабліва ў Беларусі, гэта ўжо факт. І, канешне, вялікае няшчасце ў гісторыі нашага народа, бо пачаўся рух назад да таго камуністычнага мінулага, якое мы нядаўна перажылі. І калі наша кіраўніцтва цешыць сябе тым, што, хоць кампартыя рэабілітавана, яе маёмасць засталася ў руках дзяржавы, то гэта наіўнае суцяшэнне. Яно вельмі нядоўга працягнецца, бо ў любы момант камуністычная большасць у парламенце можа паставіць пытанне аб вяртанні маёмасці КПБ, якое будзе станоўча вырашана той жа камуністычнай большасцю.

— Ні для каго не сакрэт, што ў рэспубліцы фактычна пачалася перадвыбарчая прэзідэнцкая кампанія. Што думаеце Вы пра магчымых кандыдатаў і наогул, ці зможа ўвядзенне пасады прэзідэнта рэспублікі неяк паўздзейнічаць на развіццё падзей?

— Тут цікава паглядзець, што адбываецца з ідэяй прэзідэнцкай рэспублікі ў Расіі. А там мы бачым, што зараз уся палітыка ідзе ў напрамку абмежавання ўлады прэзідэнта і пашырэння ўлады Вярхоўнага Савета. У нас жа пэўныя сілы спрабуюць рухацца якраз наадварот. Цяжка сказаць, што атрымаецца, бо Беларусь у гэтым плане не мае ніякага вопыту. І хто будзе прэзідэнтам, зараз сказаць цяжка. Але, я думаю, калі ўсё будзе так, як вырашана ў Вярхоўным Савеце, то, канешне, наўрад ці атрымаецца што добрае. А самае важнае — у нашай эканоміцы адбыліся незваротныя працэсы і ўвядзенне прэзідэнцкага кіравання ў рэспубліцы наўрад ці палепшыць становішча нашага народа.

— Васіль Уладзіміравіч, трэба ўвесь час памятаць і пра тое, што большасць нашага народа вельмі пасіўная. Ці магчымы нейкія змены пры такой абыякавасці простых людзей? Ці можа вылечыцца грамадства, калі яго большасць у першую чаргу хвалююць (вельмі не хацелася б крыўдзіць нашых людзей, але так, на жаль, атрымліваецца) праблемы свайго жывата?

— У тым і справа, што патрэбна духоўнае адраджэнне нацыі. А духоўнае адраджэнне найперш залежыць ад узроўню нацыянальнай самасвядомасці. Так, відаць, было ў гісторыі ўсіх нацый. Што датычыцца беларускай, дык яна дагэтуль яшчэ не дасягнула патрэбнага ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці. І калі няма патрэбнай палітызацыі, няма высокага разумення гістарычнай ролі нацыі і гістарычнага моманту, калі нацыя не можа зразумець свой шанц і пакарыстацца ім, дык, канешне, на што можна разлічваць? Я думаю, у першую чаргу павінна паклапаціцца пра лёс Бацькаўшчыны авангардная частка грамадства, я маю на ўвазе інтэлігенцыю. Узняць нацыю, адкрыць ёй вочы на тое, што яна можа і на што яна мае права, павінна інтэлігенцыя. На жаль, наша інтэлігенцыя таксама аказалася не на вышыні. Што датычыцца творчай інтэлігенцыі, то ў гэты лёсавызначальны момант яна наогул схавалася. У палітыцы яе няма. Яе адтуль вывелі.

— Мы гаворым пра гістарычную памяць, пра адраджэнне культуры, даём новыя ацэнкі таму, што адбылося раней. Я думаю, Вы чыталі артыкул Зянона Пазьняка ў "Звяздзе" пра Леніна і водгукі на яго. Яны розныя, але больш негатыўных, людзі не захацелі прыняць страшэнную праўду. Як ацэньваеце Вы і сам артыкул, і асобу Леніна?

— Я думаю, што праўда жыцця ніколі не можа быць амаральнай. Гэта значыць, праўда заўсёды маральная. І ў гэтым сэнсе неабходна развянчанне міфаў, якімі перапоўнена наша гісторыя. Бо наша гісторыя з'яўлялася апірышчам для таталітарнага рэжыму. Міфы былі, як слупы ў плоце, за якія трымаліся ўсе тыя, хто здзяйсняў уладу над народам, хто ўрэшце і завёў яго туды, адкуль невядома як цяпер выбрацца. Дык вось, кожнае слова праўды, сумленнае асэнсаванне нашага мінулага можа цяпер адыгрываць толькі пазітыўную ролю.

А тыя людзі, што дагэтуль усё крычаць: "Не чапайце мінулага!", "Не чапайце нашага Леніна!", канешне, гэтыя людзі нікуды і не хочуць выбірацца. Але я кажу, што без пэўнай пераацэнкі мінулага не можа быць ніякага руху наперад. Гэта мінулае — і ідэалогія, і палітыка — бервяном ляжыць на нашым шляху. І мы будзем упірацца ў яго, як у сцяну, пакуль не разбурым яе.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

Васіль БЫКАЎ:

"Гісторыя нам дала незвычайны шанц. Але Беларусь не ўмее выкарыстаць яго..."

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Паглядзіце, што робіцца ў Расіі, успомніце фільм Станіслава Гаварухіна. Там розумам рускага чалавека дадзена знішчальная ацэнка Леніна, яго асобы, яго ролі ў расійскай гісторыі. Ды і ў беларускай таксама.

Дык чаму прыкладна тое ж самае, але сказанае беларускім дэпутатам Пазьняком, выклікае такое непрыняцце з боку часткі беларускага грамадства?

— Васіль Уладзіміравіч, цікава было б пачуць Ваша меркаванне і наконт другой публікацыі, якая прагучала на ўсю рэспубліку. Я маю на ўвазе інтэрв'ю "Наш Пётр Міронавіч".

— О, тут якраз наадварот, тут ідзе стварэнне новага міфа! Усё гэта адбываецца ў рамках аднаўлення КПБ. А для таго, каб рэабілітаваць КПБ, патрэбна рэабілітаваць яе мінулае, яе гісторыю і, канешне, яе лідэраў. А з гэтых лідэраў не надта многа такіх людзей, пра якіх можна цяпер было б сказаць нешта добрае. Дык вось, робіцца патугі знайсці нейкага правадыра, калі няма яго цяпер, дык хоць у мінулым. І выбар выпаў, я так разумею, на Машэрава. Хоць, на маю думку, ён быў звычайны, ардынарны кіраўнік беларускай кампартыі, якіх шмат было і да яго, і пасля. І вызначаўся ён сярод іншых хіба што сваёй знешнасцю, некаторай ветлівасцю выгляду. Але ніяк не інтэлектам, ні асаблівасцю ўласнай палітыкі. Ён быў верным праваднікам палітыкі КПСС, гэта натуральна. Бо калі б хоць у чым-небудзь ён зрабіў нешта такое, што ішло б насуперак Маскве, дык на тым яго кар'ера і скончылася б. Гэта ж вядома, і ўсе гэта цудоўна разумелі. Але цяпер, заднім чыслом, зноў спрабуюць ствараць міф, які, канешне, далёкі ад жыцця.

— Журналіст Аляксандр Лукашук пасля працы ў архівах гаварыў, што не можа зразумець беларускіх сялян, якія пасля такіх здзекаў у час Вялікай Айчыннай вайны ўсё роўна змагаліся разам з камуністамі. Нядаўна ў Вас выйшла новая аповесць "Сцюжа", дзе Вы таксама закранаеце гэту тэму...

— Справа ў тым, што падчас вайны ў нашых людзей выбар быў невялікі. Кожны памятаў, што ён перажыў у трыццатыя гады, але ў людзей яшчэ заставалася надзея на тое, што ў далейшым што-небудзь у савецкім рэжыме зменіцца. Вазьміце тую ж прасцейшую абывацельскую думку: вось усіх ворагаў народа вынішчаць, і тады мы зажывём добра. А што датычыцца нямецкага фашызму, дык тут ніякага спадзяванку ўжо не было. Бо з самага пачатку фашысты павялі палітыку на знішчэнне беларускага народа. І народ змушаны быў выбіраць паміж дрэнным і яшчэ горшым...

Што датычыцца маёй аповесці, то я не прыдумваў нічога. Усё гэта было, прычым мела масавы характар. Я ўзяў толькі часцінку, а калі б узнавіць у мастацтве памяць людзей, якіх ужо няма, то гэта быў бы крык, быў бы жах. Бо з трыццатымі гадамі цяжка параўнаць які-небудзь іншы перыяд з нашай гісторыі...

— Тым не менш сёння, нягледзячы ні на якія цяжкасці, Беларусь — незалежная дзяржава. Але незалежнасць гэтая не падабаецца многім як за яе межамі, так і на нашай зямлі...

— Для таго, каб дзейнічаць асобна, аўтаномна, незалежна, суверэнна, трэба мець палітычную волю. Як паказвае вопыт, наша кіраўніцтва такой воляй не валодае. Яно не ўмее быць суверэнным і не хоча гэтага суверэнітэту. Вось у чым уся справа...

Нядоўгі час існавання суверэннай Беларусі паказаў, што без змены кіраўнічых, уладных структур на дэмакратычныя яе эканоміка не можа існаваць ні ў якой іншай палітычнай атмасферы, апроч таталітарнай. Рынак і камунізм — не сумяшчаюцца. Гэта асабліва стала відаць у апошні час, калі ўрад рэспублікі пад націскам генералаў ВПК заявіў аб неабходнасці новага эканамічнага саюзу з Расіяй. Хаця эканамічнага — гэта хай; куды горш, што той саюз аказваецца абумоўлены пагадненнем аб вайсковай калектыўнай бяспецы. Зрэшты, і тое натуральна, калі мець на ўвазе рэстаўрацыйныя працэсы, што гэтак нечакана замаячылі над Расіяй. Сапраўды, камуністычна-сацыялістычны лад не ведае іншых формаў грамадскага існавання, апроч як таталітарная, імперыялістычная, заснаваных на прынцыпах падпарадкавання слабейшых адной імперскай сіле. І калі нацыянал-камуністы Беларусі дагэтуль маўчалі, дык таму, што накірунак палітычных змен у Расіі нейкі час быў няпэўны. Цяпер ён выразна азначыўся. Гэта і надало палітычнага энтузіязму беларускім адэптам камунізму. Адчулі шанц. Што ж, даўно ўжо, мабыць, беларусы не выконвалі свой "інтэрнацыянальны доўг", не гналі грошы, тавар і рэсурсы на ўзбраенне Савецкай Арміі, мацаванне яе ракетных сіл, касмічнага шпіянажу за тымі, у каго цяпер просяць дапамогі. Даўно генералы Беларускай чырванасцяжнай акругі не атрымлівалі ордэнаў на грудзі і зорак на пагоны з рук крамлёўскіх валадароў. Тое, што зусім нядаўна высахлі слёзы на тварах беларускіх матак, пахаваўшых у цынкавых трунах сваіх сыноў, іх, прабачце за адкрытасць, не дужа хвалюе. І гэта — самае жахлівае.

Такова жизнь

Батарейки к бою не готовы

На земле осталось большинство самолетов одной из боевых частей ВВС России в Витебской области после приказа о начале ночных полетов. Иссяк запас питания в батарейках ручных фонариков, с помощью которых механики проверяют готовность ряда узлов воздушных машин. Не оказалось микроаккумуляторов тока и на воинском складе.

Бывает...

Обувь от ГАИ

Большую партию кожи "поставили" на витебскую фабрику "Красный Октябрь" работники ГАИ Бешенковичского района. Они задержали автомашину, перевозившую без лицензии дефицитный груз из Гатова Минской области в Санкт-Петербург.

Обувщики с удовольствием заплатили 11 миллионов рублей за неожиданное, но всегда нужное сырье. Деньги распределены между многими государственными структурами, начиная с Минфина и кончая районным судом. Без малого 3 миллиона рублей перечислено в бюджет Витебского УВД. В качестве стимула для новых "находок" на дорогах.

Сергей СЕРГЕЕВ.

Эх, рынак...

Селяніну не свеціць прыбытак на асфальце

Цяпер проста не верыцца, што ў нядаўнім мінулым веснавая сяўба крэдытавалася банкамі пад адзін ці два працэнты. А сёлета ўзяць крэдыт няпроста нават па высокіх стаўках: не хапае грошай.

Аднак, як сцвярджае намеснік начальніка Глаўка па вытворчасці і перапрацоўцы прадукцыі раслінаводства Мінсельгаспрода рэспублікі Вячаслаў Герасімовіч, — сяўбу сяляне правядуць. Праблемы могуць быць з якасцю і тэрмінам, паколькі хлебаробы сутыкаюцца з цяжкасцямі ва ўсім: ад дэфіцыту запчастак да сельскагаспадарчых машын да дэфіцыту спецадзення.

Але сеяць трэба, нягледзячы на эканамічныя праблемы і цяжар цяперашніх крэдытаў. Калгасніку і фермеру не свеціць рабіць грошы на асфальце з паветра.

Белінфарм.

Нейтралітэт або калектыўная бяспека?

Ці супярэчыць уваходжанне Беларусі ў сістэму калектыўнай бяспекі краін СНД Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі, згодна з якой рэспубліка павінна стаць бяз'ядзернай і нейтральнай дзяржавай? Такая асноўная сутнасць дыскусіі, якая разгарнулася на нечарговай адзінаццатай сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі пасля даклада Станіслава Шушкевіча аб становішчы ў рэспубліцы і важных пытаннях яе ўнутрыпалітычнай і знешнепалітычнай дзейнасці.

Дагавор "Аб калектыўнай бяспецы" краін СНД быў прыняты ў маі 1992 года на сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў і кіраўнікоў урадаў у Ташкенце. На дакуменце стаяць подпісы кіраўнікоў Арменіі, Расіі, Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана, Туркменістана, Узбекістана. Беларусь, Украіна, Малдова дагавор не падпісвалі.

Для таго, каб падрыхтаваць экспертныя заключэнні аб суадносінах нейтралітэту рэспублікі і калектыўнай бяспекі СНД, вырашана часова, да 8 красавіка, спыніць работу нечарговай адзінаццатай сесіі парламента. У сувязі з гэтым адбудуцца пасяджэнні адпаведных парламенцкіх камісій. Свае заключэнні павінны прадставіць міністэрствы абароны, замежных спраў, юстыцыі, інстытут дзяржаўнага будаўніцтва і заканадаўства. Пытанне будзе абмеркавана на пасяджэннях Прэзідыума Савета Міністраў, Савета бяспекі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета. Для падрыхтоўкі праекта пастановы, які будзе прадстаўлены народным дэпутатам, створана спецыяльная група на чале з першым намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета Вячаславам Кузняцовым.

Ніжэй публікуюцца поўныя тэксты Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь і дагавора "Аб калектыўнай бяспецы" краін СНД.

Прэс-служба ВС Рэспублікі Беларусь.

ДЭКЛАРАЦЫЯ

Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі,

выяўляючы волю народа Беларускай ССР,

усведамляючы адказнасць за лёс беларускай нацыі,

пацвярджаючы павагу годнасці і правоў людзей усіх нацыянальнасцей, якія пражываюць у Беларускай ССР,

засведчваючы павагу да суверэнных правоў усіх народаў Саюза ССР і свету,

лічачы рэспубліку паўнапраўным і незалежным членам сусветнага супольніцтва,

дзейнічаючы ў адпаведнасці з прынцыпамі Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і іншымі агульнапрызнанымі міжнароднаправавымі актамі,

урачыста абвяшчае поўны дзяржаўны суверэнітэт Беларускай ССР як вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады рэспублікі ў межах яе тэрыторыі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць рэспублікі ў знешніх адносінах і заяўляе аб рашучасці стварыць прававую дзяржаву.

Артыкул 1

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка — суверэнная дзяржава, што ўсталявана на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу.

Неад'емныя правы Беларускай ССР як суверэннай дзяржавы рэалізуюцца ў адпаведнасці з агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права. Беларуская ССР ахоўвае і абараняе нацыянальную дзяржаўнасць беларускага народа.

Беларуская ССР мае свой герб, сцяг і гімн.

Любыя гвалтоўныя дзеянні супраць нацыянальнай дзяржаўнасці Беларускай ССР з боку палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў ці асоб праследуюцца па закону.

Артыкул 2

Грамадзяне Беларускай ССР усіх нацыянальнасцей складаюць беларускі народ, які з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў рэспубліцы. Яго поўнаўладдзе рэалізуецца непасрэдна і праз прадстаўнічыя органы дзяржаўнай улады.

Права выступаць ад імя ўсяго народа рэспублікі належыць выключна Вярхоўнаму Савету Беларускай ССР.

Артыкул 3

Дзяржаўны суверэнітэт Беларускай ССР сцвярджаецца ў імя вышэйшай мэты — свабоднага развіцця і дабрабыту, годнага жыцця кожнага грамадзяніна рэспублікі на аснове забеспячэння правоў асобы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Беларускай ССР і яе міжнароднымі абавязацельствамі.

Артыкул 4

Грамадзянства Беларускай ССР з'яўляецца неад'емнай часткай яе суверэнітэту. Рэспубліка ахоўвае гонар, здароўе, правы і законныя інтарэсы сваіх грамадзян, забяспечвае іх сацыяльную абароненасць. Яны знаходзяцца пад яе абаронай, будучы за межамі Беларускай ССР. Рэспубліка прымае ў грамадзянства і вырашае пытанні аб выхадзе з грамадзянства.

Артыкул 5

Зямля, яе нетры, іншыя прыродныя рэсурсы на тэрыторыі Беларускай ССР, паветраная прастора з'яўляюцца ўласнасцю беларускага народа, якому належаць выключныя правы валодання, карыстання і распараджэння імі.

Вызначэнне прававога рэжыму ўсіх відаў маёмасці адносіцца да выключнай кампетэнцыі Беларускай ССР.

Беларуская ССР мае права на сваю долю ў агульнасаюзнай маёмасці адпаведна ўкладу беларускага народа і як рэспубліка-заснавальніца Савецкага Саюза, якая была яго правадзейным суб'ектам, мае права на сваю долю ад алмазнага, валютнага фондаў і залатога запасу СССР.

Беларуская ССР утварае нацыянальны банк, падпарадкаваны Вярхоўнаму Савету рэспублікі, стварае сваю фінансава-крэдытную сістэму, пацвярджае правы ўласнасці на спецыялізаваныя банкі, якія знаходзяцца на яе тэрыторыі на момант прыняцця гэтай Дэкларацыі, арганізуе ўласныя падатковую і мытную службы, мае права на стварэнне ўласнай грашовай сістэмы.

Артыкул 6

Тэрыторыя Беларускай ССР з'яўляецца непадзельнай і недатыкальнай і не можа быць зменена або выкарыстана без згоды Беларускай ССР.

Усе пытанні аб граніцах вырашаюцца толькі на аснове ўзаемнай згоды паміж Беларускай ССР і сумежнымі суверэннымі дзяржавамі шляхам заключэння адпаведных дагавораў, якія падлягаюць ратыфікацыі ў Вярхоўным Савеце Беларускай ССР.

Артыкул 7

На тэрыторыі Беларускай ССР устанаўліваецца вяршэнства Канстытуцыі Беларускай ССР і законаў Беларускай ССР.

Усе грамадзяне і асобы без грамадзянства, дзяржаўныя органы, прадпрыемствы, установы і арганізацыі, якія знаходзяцца або дзейнічаюць на тэрыторыі Беларускай ССР, абавязаны выконваць заканадаўства Беларускай ССР.

Размежаванне заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады з'яўляецца важнейшым прынцыпам існавання Беларускай ССР як прававой дзяржавы.

Вышэйшы нагляд за дакладным і аднастайным выкананнем законаў Беларускай ССР ажыццяўляецца Генеральным пракурорам Беларускай ССР, які назначаецца Вярхоўным Саветам Беларускай ССР.

Артыкул 8

Беларуская ССР самастойна ўстанаўлівае парадак арганізацыі на тэрыторыі рэспублікі аховы прыроды, выкарыстання прыродных рэсурсаў і забяспечвае народу рэспублікі экалагічную бяспеку.

Беларуская ССР мае права на пакрыццё страт, нанесеных ёй дзеяннямі саюзных органаў, саюзных рэспублік і іншых дзяржаў.

Беларуская ССР патрабуе ад урада СССР безумоўнай і тэрміновай кампенсацыі страт, звязаных з пераадоленнем вынікаў чарнобыльскай катастрофы.

Сваю свабоду і суверэнітэт Беларуская ССР у першую чаргу выкарыстоўвае на выратаванне народа Беларускай ССР ад вынікаў чарнобыльскай катастрофы.

Артыкул 9

Беларуская ССР самастойная ў вырашэнні пытанняў культурнага і духоўнага развіцця беларускай нацыі, іншых нацыянальных супольнасцей рэспублікі, у стварэнні ўласнай сістэмы інфармацыі, адукацыі і выхавання.

Беларуская ССР забяспечвае функцыяніраванне беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, захаванне нацыянальных традыцый і гістарычнай сімволікі.

Нацыянальныя культурныя і гістарычныя каштоўнасці на тэрыторыі Беларускай ССР з'яўляюцца выключна ўласнасцю рэспублікі і яе грамадзян.

Артыкул 10

Беларуская ССР мае права на ўласныя ўзброеныя сілы, унутраныя войскі, органы дзяржаўнай і грамадскай бяспекі, падкантрольныя Вярхоўнаму Савету Беларускай ССР.

Беларуская ССР мае суверэннае права вызначаць парадак і ўмовы праходжання яе грамадзянамі вайсковай службы, службы ў органах дзяржаўнай і грамадскай бяспекі, вырашаць пытанні размяшчэння войск і ўзбраення на сваёй тэрыторыі.

Ніякія вайсковыя фарміраванні іншых краін, іх ваенныя базы і пабудовы не могуць быць размешчаны на тэрыторыі Беларускай ССР без згоды яе Вярхоўнага Савета.

Беларуская ССР ставіць мэтай зрабіць сваю тэрыторыю бяз'ядзернай зонай, а рэспубліку — нейтральнай дзяржавай.

Артыкул 11

Беларуская ССР самастойна ажыццяўляе правы на добраахвотныя саюзы з іншымі дзяржавамі і свабодны выхад з гэтых саюзаў.

Беларуская ССР прапануе неадкладна пачаць распрацоўку дагавора аб саюзе суверэнных сацыялістычных дзяржаў.

Артыкул 12

Палажэнні гэтай Дэкларацыі рэалізуюцца Вярхоўным Саветам Беларускай ССР шляхам прыняцця новай Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Беларускай ССР, законаў Беларускай ССР.

"Не!" — ваеннаму саюзу!

Зварот грамадскіх арганізацый Беларусі да Вярхоўнага Савета і ўрада рэспублікі

Нечарговая 11-я сесія Вярхоўнага Савета шмат часу адвяла абмеркаванню прапановы Старшыні Савета Міністраў В.Кебіча аб заключэнні эканамічнага і вайсковага саюзу Беларусі з Расійскай Федэрацыяй. Кожнаму грамадзяніну нашай рэспублікі зразумела, якую велізарную ролю могуць адыграць гэтыя пагадненні ў далейшым лёсе нашае Радзімы.

Аднак характар абмеркавання гэтых пытанняў у Вярхоўным Савеце выклікае глыбокія расчараванні і занепакоенасць.

З боку дэпутацкай большасці Вярхоўнага Савета не прагучала нічога, што хаця б аддалена нагадвала цвярозы эканамічны разлік тых вынікаў і наступстваў, якія чакаюць Беларусь у выпадку падпісання прапанаваных пагадненняў. Ігнаруецца факт невыканання ўжо дасягнутых дамоўленасцей і эканамічных пагадненняў. Не прымаюцца пад увагу даныя афіцыйных расійскіх органаў аб працягу пагрозлівага спаду ўсіх паказчыкаў дзейнасці народнай гаспадаркі Расіі. Толькі за першы квартал бягучага года ў параўнанні з першым кварталам мінулага нацыянальны даход скараціўся на 21%, здабыча нафты — на 16%, выраб мяса і малака — на 22—25%.

Замест таго, каб разгортваць рэформы, вызваляць эканамічную ініцыятыву, шукаць новыя крыніцы энергетычных і сыравінных паставак, заваёўваць рынкі для збыту беларускіх тавараў, сілы камуністычнага рэваншу імкнуцца ўцягнуць Беларусь назад у разваліўшуюся імперыю. Але што можа прынесці цесны эканамічны саюз з Расіяй у такіх варунках? Толькі далейшую інфляцыю, дэфіцыт і жабрацтва.

І зусім недапушчальна, як гэта робяць асобныя дэпутаты большасці, увязваць пытанні аб эканамічным саюзе з саюзам вайсковым. Сённяшняй Беларусі ніхто не пагражае, і таму няма ніякіх падстаў адмаўляцца ад абвешчанай Вярхоўным Саветам палітыкі нейтралітэту. А калі ж заключэнне вайсковага саюзу з'яўляецца ўмоваю для ўсталявання эфектыўных і ўзаемавыгадных эканамічных сувязей, то такая ўмова з'яўляецца цалкам амаральнай і непрымальнай. Беларускі народ не можа і не будзе плаціць за нафту крывёю сваіх сыноў. А што плаціць прыйдзецца — відавочна. На неабсяжных расійскіх межах палыхаюць узброеныя канфлікты. Па афіцыйных звестках, ад службы ў войску ўхіляецца больш як палова расійскіх прызыўнікоў.

Таму вайсковы саюз з Расіяй, да якога заклікаюць многія дэпутаты Вярхоўнага Савета, — гэта здрада нацыянальным інтарэсам. Гэта вяртанне ў сярэднявечча, калі ганебную даніну крывёю плацілі пераможаныя і рабы.

Заклікаем вас адмовіцца ад авантурных прапаноў, якія прынясуць шкоду нашым людзям і нашай Бацькаўшчыне.

Ад Беларускага народнага фронту "Адраджэнне" — Юрый ХАДЫКА, ад Беларускага згуртавання вайскоўцаў — Мікалай СТАТКЕВІЧ, ад Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі — Аляксандр ДАБРАВОЛЬСКІ, Васіль БЫКАЎ — народны пісьменнік Беларусі, Георгій ШТЫХАЎ — прэзідэнт асацыяцыі ахвяр палітычных рэпрэсій, Радзім ГАРЭЦКІ — акадэмік, Анатоль ГУРЫНОВІЧ — намеснік старшыні Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, Галіна ВАШЧАНКА — старшыня камітэта "Дзеці Чарнобыля", Тадэвуш ТАРАСЕВІЧ — намеснік старшыні Саюза палякаў Беларусі, ад Беларускага рэспубліканскага фонду падтрымкі дэмакратычных рэформ імя Я.Сапегі — Валерый ГРЫЦУК, Ганна СУРМАЧ — сябра Рады згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", Віктар СУПРУНЧУК — намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, Аляксей ДУДАРАЎ — драматург, ад Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў — Адам МАЛЬДЗІС, Людміла ПЕЦІНА — старшыня жаночага хрысціянска-дэмакратычнага руху Беларусі, Рыгор БАРАДУЛІН — прэзідэнт ПЭН-клуба, Мікола САВІЦКІ — прафесар Беларускага эканамічнага універсітэта, старшыня Мінскай гарадской рады ТБМ імя Скарыны і іншыя — усяго 50 подпісаў.

Вакол скандалу

Аб ролі смеху ў жыцці рэспублікі і яго ўплыве на палітычную і эканамічную стабільнасць

Алесь СІВЫ

Першакрасавіцкія жарты ўжо традыцыйна сталі неад'емнай часткай нашага жыцця, і калі раней на заўвагу: "Ой, у вас пінжак белы!"— людзі рэагавалі па-свойму правільна, то зараз з гумарам у нас пэўны крызіс.

У канкрэтным выпадку размова ідзе пра радыёстанцыю "Беларуская маладзёжная". Першага красавіка ў эфіры радыёстанцыі суровы дыктарскі голас, перапыніўшы лёгкую музыку, аб'явіў: "Праз некалькі хвілін чакаецца афіцыйнае паведамленне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь". І калі наспеў час зрабіць "паведамленне", той жа голас дадаў: "Ну чаго вы ўсе ад мяне чакаеце? З 1 красавіка вас! Будзьце здаровы!"

Рэзананс адбыўся. І яшчэ які! 2 красавіка на свет з'яўляецца загад па Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Беларусі "Аб папярэдніх мерах, звязаных з выдачай у эфір перадачы радыёстанцыі "Беларуская маладзёжная"..., ствараецца спецыяльная камісія, якая да 9 красавіка разгледзіць лёс "маладзёжкі". Першакрасавіцкі жарт ператварыўся ў буйны скандал, а яго дзеючыя асобы сёння зусім не жартуюць. Чым ён закончыцца, не возьмецца прадказаць ніхто. Магчыма, жарт атрымаўся і сапраўды крыху няўдалы ў наш трывожна-грашовы час — і тым не менш: няўжо мы так затуркалі сябе чэргамі, цэнамі на яйкі і каўбасу, што, калі нам скажуць па тэлевізары: "піф!", мы, нібы прусакі, шыбанём хавацца пад ложак? Няўжо нас так запалохалі, што пачуццё гумару зусім адмерла?!

Дарэчы, кіраўніцтва тэлерадыёкампаніі, што вельмі прыемна, заўсёды дазваляла "маладзёжцы" эксперыментаваць, а таму будзе вельмі і вельмі крыўдна, калі супраць яе будуць прыняты бязлітасныя карныя меры.

І яшчэ. 1 красавіка польскае радыё перадало інфармацыю: прэм'ер-міністр Польшчы Ганна Сухоцка праз сваю прэс-службу аб'явіла аб тым, што па рэспубліцы будзе адменена ўрадавая праграма паўсюднай прыватызацыі. Безумоўна, гэта жарт. І, што цікава, ніхто нават не падумаў ствараць камісію, каб пакараць супрацоўнікаў польскай радыёстанцыі. Людзі проста пасмяяліся...

Здарэнні

Самалёт не ўзляцеў

Супрацоўнікі УКДБ па Гродзенскай вобласці спынілі спробу вывазу за межы рэспублікі буйной сумы грошай — больш як 100 мільёнаў наяўных расійскіх рублёў. Грошы былі ўпакаваны ў 17 мяшкоў, знаходзіліся ў спецыяльна зафрахтаваным самалёце, які ўжо рыхтаваўся да палёту, і прызначаліся быццам бы на закупку для рэгіёна гаруча-змазачных матэрыялаў.

Дзякуючы паспяхова праведзенай беларускімі чэкістамі і іх калегамі з Украіны аперацыі кантрабандны самалёт не падняўся ў паветра. Стала вядома, што дакументы на атрыманне такой вялікай сумы ліпавыя і ніякага дагавору на пастаўку гаручага няма.

Па гэтаму факту вядзецца следчы разбор.

г.Гродна.

Медзь усё яшчэ ў цане

Дванаццаць кіламетраў меднага кабелю ўкрадзены на ціхім чыгуначным перагоне паміж станцыямі Татарка і Ясень — пашкоджаны каналы сувязі і сігналізацыі. Страты, нанесеныя Асіповіцкаму чыгуначнаму вузлу, ацэньваюцца ў 1,3 мільёна рублёў. Адзін са злодзеяў Б. злоўлены з доказамі злачынства. Работнікі раённага аддзела міліцыі вядуць следства.

Мікалай НАЗАРОВІЧ, Белінфарм.

г.Асіповічы.

ДАГАВОР

аб калектыўнай бяспецы

Дзяржавы—удзельніцы гэтага Дагавора, якія называюцца ў далейшым "дзяржавы-ўдзельніцы",

кіруючыся дэкларацыямі аб суверэнітэце незалежных дзяржаў, улічваючы стварэнне дзяржавамі-ўдзельніцамі ўласных узброеных сіл, прымаючы ўзгодненыя дзеянні ў інтарэсах забеспячэння калектыўнай бяспекі,

прызнаючы неабходнасць строгага выканання заключаных дагавораў, што датычаць скарачэння ўзбраенняў, узброеных сіл і ўмацавання мер даверу, дагаварыліся аб наступным.

Артыкул 1

Дзяржавы-ўдзельніцы пацвярджаюць абавязацельства ўстрымлівацца ад прымянення сілы або пагрозы сілай у міждзяржаўных адносінах. Яны абавязваюцца вырашаць усе рознагалоссі паміж сабой і з іншымі дзяржавамі мірнымі сродкамі.

Дзяржавы-ўдзельніцы не будуць уступаць у ваенныя саюзы або прымаць удзел у якіх-небудзь групоўках дзяржаў, а таксама ў дзеяннях, накіраваных супраць іншай дзяржавы-ўдзельніцы.

У выпадку стварэння ў Еўропе і Азіі сістэмы калектыўнай бяспекі і заключэння з гэтай мэтай дагавораў аб калектыўнай бяспецы, да чаго няўхільна будуць імкнуцца дагаворныя бакі, дзяржавы-ўдзельніцы ўступяць у неадкладныя кансультацыі адна з адной з мэтай унясення неабходных намераў у гэты Дагавор.

Артыкул 2

Дзяржавы-ўдзельніцы будуць кансультавацца адна з адной па ўсіх важных пытаннях міжнароднай бяспекі, якія закранаюць іх інтарэсы, і ўзгадняць па гэтых пытаннях пазіцыі.

У выпадку ўзнікнення пагрозы бяспецы, тэрытарыяльнай цэласнасці і суверэнітэту адной або некалькіх дзяржаў-удзельніц або пагрозы міжнароднаму міру і бяспецы дзяржавы-ўдзельніцы будуць неадкладна прыводзіць у дзеянне механізм сумесных кансультацый з мэтай каардынацыі сваіх пазіцый і прыняцця мер для ліквідацыі ўзнікшай пагрозы.

Артыкул 3

Дзяржавы-ўдзельніцы ўтвараюць Савет калектыўнай бяспекі ў саставе кіраўнікоў дзяржаў-удзельніц і галоўнакамандуючага аб'яднанымі ўзброенымі сіламі Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Артыкул 4

Калі адна з дзяржаў-удзельніц падвергнецца агрэсіі з боку якой-небудзь дзяржавы або групы дзяржаў, то гэта будзе разглядацца як агрэсія супраць усіх дзяржаў-удзельніц гэтага Дагавора.

У выпадку ўчынення акта-агрэсіі супраць любой з дзяржаў-удзельніц усе астатнія дзяржавы-ўдзельніцы прадаставяць ёй неабходную дапамогу, уключаючы ваенную, а таксама акажуць падтрымку наяўнымі ў іх распараджэнні сродкамі ў парадку ажыццяўлення правоў на калектыўную абарону ў адпаведнасці з артыкулам 51 Статута ААН.

Аб мерах, прынятых на падставе гэтага артыкула, дзяржавы-ўдзельніцы неадкладна паведамяць Савету Бяспекі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Пры ажыццяўленні гэтых мер дзяржавы-ўдзельніцы будуць прытрымлівацца адпаведных палажэнняў Статута ААН.

Артыкул 5

Каардынацыю і забеспячэнне сумеснай дзейнасці дзяржаў-ўдзельніц у адпаведнасці з гэтым Дагаворам бярэ на сябе Савет калектыўнай бяспекі дзяржаў-удзельніц і ствараемыя ім органы. Да стварэння ўказаных органаў каардынацыю дзейнасці ўзброеных сіл дзяржаў-удзельніц ажыццяўляе галоўнае камандаванне аб'яднаных узброеных сіл Садружнасці.

Артыкул 6

Рашэнне аб выкарыстанні ўзброеных сіл у мэтах адбіцця агрэсіі ў адпаведнасці з артыкулам з гэтага Дагавора прымаецца кіраўнікамі дзяржаў-удзельніц.

Выкарыстанне ўзброеных сіл за межамі тэрыторыі дзяржаў-удзельніц можа ажыццяўляцца выключна ў інтарэсах міжнароднай бяспекі ў строгай адпаведнасці са Статутам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і заканадаўствам дзяржаў — удзельніц гэтага Дагавора.

Артыкул 7

Размяшчэнне і функцыяніраванне аб'ектаў сістэмы калектыўнай бяспекі на тэрыторыі дзяржаў-удзельніц рэгулюецца спецыяльнымі пагадненнямі.

Артыкул 8

Гэты Дагавор не закранае правоў і абавязацельстваў па іншых дзеючых двухбаковых і шматбаковых дагаворах і пагадненнях, заключаных дзяржавамі-ўдзельніцамі з іншымі дзяржавамі, і не накіраваны супраць трэціх краін.

Гэты Дагавор не закранае правоў дзяржаў-удзельніц на індывідуальную і калектыўную абарону ад агрэсіі ў адпаведнасці са Статутам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Дзяржавы-ўдзельніцы абавязваюцца не заключаць міжнародныя пагадненні, несумяшчальныя з гэтым Дагаворам.

Артыкул 9

Любыя пытанні, якія ўзнікаюць паміж дзяржавамі-ўдзельніцамі адносна тлумачэння або прымянення якога-небудзь палажэння гэтага Дагавора, будуць вырашацца сумесна, у духу дружбы, узаемнай павагі і ўзаемаразумення.

Папраўкі да гэтага Дагавора могуць уносіцца па ініцыятыве адной або некалькіх дзяржаў-удзельніц і прымаюцца на аснове ўзаемнай згоды.

Артыкул 10

Гэты Дагавор адкрыты для далучэння ўсіх зацікаўленых дзяржаў, якія падзяляюць яго мэты і прынцыпы.

Артыкул 11

Гэты Дагавор заключаецца на пяць гадоў з наступным прадаўжэннем.

